Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт мастацкай культуры
Кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| __________ Р.Ф.Шаура | __________ А.В.Пагоцкая |
| “24” 05 2024 | “17” 06 2024 |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС (ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС) ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

## “СКУЛЬПТУРА”

для спецыяльнасці 6-05-0213-02 “Декаратыўна-прыкладное мастацтва”
прафілізацыя “Рэстаўрацыя вырабаў”, “Народныя ремёствы і этнадызайн”

Складальнік: старшы выкладчык
кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва
Матвейчык С.В.

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Савета універсітэта 17 06 2024 г.
Пратакол № 11

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………..... | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………..… | 5 |
| 2.1 | Скульптура як від выяўленчага мастацтва…………………………… | 5 |
| 2.2 | Беларуская школа скульптуры……………………………………….. | 20 |
| 2.3 | Беларуская скульптура ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя ......................... | 21 |
| 2.4 | Дэкаратыўная скульптура…………………………………………….. | 23 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………. | 24 |
| 3.1 | Матэрыялы і абсталяванне майстэрні……………………………... | 24 |
| 3.2 | Лепка геаметрычных цел……………………………………………... | 28 |
| 3.3 | Рэльеф. Разетка………………………………………………………… | 28 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………………... | 30 |
| 4.1 | Заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў…………. | 30 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ………………………….................. | 32 |
| 5.1 | Вучэбная праграма……………………………………………........ | 32 |
| 5.2 | Асноўная літаратура………………………………………………... | 52 |
| 5.3 | Дадатковая літаратура……………………………………….….. | 53 |

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Скульптура” з’яўляецца адным з кампанентаў адукацыйнага працэсу прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў кафедры “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”.

Вучэбная дысцыпліна “Скульптура” арганічна звязана з шэрагам іншых вучэбных дысцыплін: “Малюнак”, “Кампазіцыя”, “Перспектыва”, “Матэрыялазнаўства”, “Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”, “Беларуская і сусветная літаратура”, ”Гісторыя”, “Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў”, “Псіхалогія”, “Гісторыя сусветнага і беларускага мастацтваў”, “Графіка станковая і прыкладная”.

Асноўная мэта вучэбна-метадычнага комплекса – метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэса па дысцыпліне “Скульптура”.

Асноўныхай функцыяй вучэбна-метадычнага комплекса з’яўляецца раскрыццё зместу дысцыпліны “Скульптура”.

Задачы вучэбна-метадычнага комплекса:

- азнаямленне з гісторыяй беларускай скульптуры;
- авалоданне тэрміналогіяй скульптары;
- набыццё ведаў пра кампазіцыйную ў скульптуры, рытміку і пластыку формы;
- авалоданне асновамі формаўтварэння і методыкай выканання скульптуры, набыццё ведаў пра каркасную канструкцыю формы;
- развіццё уменняў дэкаратыўнай трактоўкі формы;
- азнаямленне з тэхналогіяй фармоўкі з гіпсу.

У выніку засваення дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

- асноўныя перыяды станаўлення беларускай школы скульптуры,
- асноўныя тэрміны і паняцці скульптуры;

*умець*:

- рабіць каркас для круглай скульптуры,
- граматна будаваць круглую скульптурную кампазіцыю ў мяккім матэрыяле,
- выконваць рэльефную скульптурную кампазіцыю ў мяккім матэрыяле,
- рабіць чарнавую фармоўку рэльефнай кампазіцыі з гіпса,

*валодаць*:

- навыкамі мадэліроўкі аб’ёмнай формы,
- навыкамі перадачы характару формы,
- прыёмамі дэкаратыўнай стылізацыі формы.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік, іспыт.

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 2.1 Скульптура як від выяўленчага мастацтва.

Вызначэнне скульптуры. Выразныя сродкі скульптуры. Віды і жанры скульптуры. Круглая скульптура. Рэльеф. Манументальная скульптура. Манументальна-дэкаратыўная скульптура. Станкавая скульптура. Скульптура малых форм. Барэльеф. Гарэльеф. Контррэльеф. Койланагліф. Першыя статуэткі.

Скульптура – адзін з відаў мастацтва, які перадае аб’ёмна-прасторавае ўяўленне пра матэрыяльныя прадметы.

Слова “скульптура” лацінскага паходжання, (упершыню ўвялі ў зварот рымляне) абазначае “выразаць, “высякаць”.

Тэрмін “скульптура” –

- абазначае не толькі від мастацтва, звязаны з мастацкім увасабленнем рэчаіснасці ў аб’ёмна-пpacтopaвых формах але і самі творы гэтага мастацтва – статуі, бюсты, рэльефы.
- сінонім тэрміна “пластыка", аднак апошні выкарыстоўваецца і як паняцце для вызначэння асаблівасцяў і якасцяў паверхняў і аб’ёмаў, і як тэхніка ў рабоце з мяккімі матэрыяламі.

У перакладзе з грэчаскага “пластыка” азначае тое самае, што і скульптура. У сучаснай мове пад пластыкай разумеюць рытмічнае спалучэнне форм і мас, а таксама выразную характарыстыку поз, рухаў і сукупнасць усіх элементаў мастацкага твора. Навучанне рамяству скульптара не пагражае стратай індывідуальнасці, а, наадварот, добрасумленна авалодаўшы майстэрствам, набывае ўпэўненасць і навыкі, неабходныя для выражэння асабістага ўспрыняцця навакольнай рэчаіснасці.

**Віды скульптуры** Скульптуру падзяляюць на круглую скульптуру (свабодна размешчаная ў прасторы) і рэльеф (аб’ёмныя выявы размешчаны на плоскасці).

Круглую скульптуру падзяляюць на

- станкавую,
- манументальную,
- манументальна-дэкаратыўную,
- мініяцюру.

Манументальная і манументальна-дэкаратыўная скульптура цесна звязаны з архітэктурай.

*Станкавая скульптура* – від скульптуры, які мае самастойнае значэнне, разлічаны на ўспрыняцце з блізкай адлегласці і не звязаны з архітэктурай і

<table>
<tr><td colspan="2">прадметным асяроддзем. Звычайна памер станкавай скульптуры набліжаны да натуральнай велічыні. Станкавай скульптуры ўласцівы псіхалагізм, апавядальнасць, часта выкарыстоўваецца сімвалічная і метафарычная мова. Станкавая скульптура ўключае розныя віды скульптурнай кампазіцыі:<br>• галава,<br>• бюст,<br>• торс,<br>• фігура,<br>• група.<br>Адным з найбольш важных жанраў станкавай скульптуры з’яўляецца партрэт, які дае ўнікальную магчымасць для ўспрыняцця з розных кропак бачання, што дае магчымасць для шматбаковай характарыстыкі партрэціруемага.</td></tr>
<tr><td></td><td>Бюст - пагруднае, паясное ці аплечная выява чалавека ў круглай скульптуры</td></tr>
<tr><td colspan="2"></td></tr>
<tr><td></td><td>Скульптура малых форм – невялікія скульптурныя творы для азлаблення інтэр’ера. Да скульптуры малых форм адносяцца жанравыя статуэткі, настольныя партрэтныя выявы</td></tr>
<tr><td colspan="2"></td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
|  | **Скульптурная група** |
| | |
|  | **Статуэтка** - від дробнай пластыкі - статуя настольнага (кабінетнага) памеру нашмат меншая за натуральную велічыню для аздаблення інтэр’ера |
| | |

| | |
|---|---|
|  | **Статуя** – асобная аб'ёмная выява чалавечай фігуры ў рост, жывёлы ці фантастычнай істоты. Звычайна статуя размяшчаецца на пастаменце |
| | |
|  | **Торс** – скульптурная выява тулава чалавека без галавы, рук і ног. Торс можа быць абломкам антычнай скульптуры або самастойнай скульптурнай кампазіцыяй. |
| | |

*Манументальная скульптура* – скульптура, непасрэдна звязаная з архітэктурным асяроддзем. Вылучаецца буйнымі памерамі і значнасцю ідэй. Размяшчаецца ў гарадскім ці прыродным асяроддзі, арганізоўвае архітэктурны ансамбль, арганічна ўваходзіць у натуральны ландшафт, аздабляе плошчы, архітэктурныя комплексы, ствараючы прасторавыя кампазіцыі, якія могуць уключаць у сябе архітэктурныя збудаванні.

| | |
|---|---|
|  | **Мемарыял** |
| | |
|  | **Манумент -** помнік значных памераў у гонар маштабнай гістарычнай падзеі, выбітнага грамадскага дзеяча і г. д. |
| | |
|  | **Манументальная скульптура**, разлічана на ўспрыняцце з вялікай адлегласці, выконваецца з даўгавечных матэрыялыў (граніт, бронза, медзь, сталь) і ўсталёўваецца на вялікай адкрытай прасторы (на натуральных узвышшах, на штучна створаных насыпах). |
| | |

| | |
|---|---|
|  | **Стэла** - вертыкальная каменная пліта з надпісам, рэльефнай ці жывапіснай выявай. |
| | |
|  | **Абеліск** - четырехгранны, зверху звужаны слуп, завершаны завастрэннем у выглядзе піраміды. |
| | |
|  | **Растральная калона** - асобная калона, ствол якой аздоблены скульптурнымі выявамі насавой часткі караблёў |
| | |

<table>
<tr><td></td><td>Трыумфальная арка, трыумфальная брама, трыумфальная калона - урачыстае збудаванне ў гонар военных перамог і іншых значных падзей.</td></tr>
<tr><td></td><td></td></tr>
<tr><td colspan="2">Манументальна-дэкаратыўная скульптура цесна звязана з архітэктурай і прыродным ландшафтам. Яна служыць для аздаблення фасадаў і інтэр’ераў будынкаў, уключаецца ў садова-паркавы ансамбль.</td></tr>
<tr><td colspan="2">Манументальна-дэкаратыўная скульптура служыць апорай у архітэктурнай канструкцыі:</td></tr>
<tr><td></td><td>Атлант - калона ў выглядзе мужчынскай, скульптурнай фігуры, якая падтрымлівае карніз, балкон і г.д.</td></tr>
<tr><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>Канефора (ад лац. canephoros – якая нясе карзіну) – арганічна ўпісаная ў архітэктуру будынка скульптурная выява жаночай фігуры з карзінай на галаве. Канструктыўна канефоры выконваюць функцыі калон.</td></tr>
<tr><td></td><td></td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
|  | **Карыятыда** (ад грэч. karyatis, літ. – жрыца храма Артэмідыў Карыяху Старажытнай Грэцыі) – скульптурная выява жаночай фігуры, якая служыць апорай балкі ў будынку. Звычайна карыятыды прыхілены да сцяны ці выступаюць з яе. |
| | |
|  | **Кансоль** (ад фр. console) - тып апоры ці кранштэйна з адным жорстка замацаваным канцом і другім свабодным канцы. Кансоль выкарыстоўваецца для падпоркі якой-небудзь выступаючай часткі збудавання, напрыкад, карніза, балкона, сцяннога вертыкальнага ўступа і інш. |
| | |
|  | **Пратома** (ад грэч. - морда, галава) – скульптурная выява пярэдняй часткі быка, каня, іншай жывёлы ці чалавека. |
| Манументальна-дэкаратыўная скульптура служыць аздабленню будынка: | |

| | |
|---|---|
|  | **Акратэрый** (ад грэч. akroterion - вяршыня, край) - скульптурнае аздабленне, якое размяшчаюць над вугламі франтона архітэктуры, пабудаванай з выкарыстаннем класічнага ордэра. |
| | |
|  | **Біга** – скульптурная выява калясніцы, запрэжанай коньмі, размешчаная на будынку ці на арцы. |
| | |
|  | **Дэсюдэпорт** (ад фр. dessusdeporte, літ. «над дзвярыма») - жывапіснае ці скульптурнае пано, размешчанае над дзвярыма і звязанае з імі агульным дэкаратыўным аздабленнем. |
| | |
|  | **Капітэль** (ад лац. caput - галава) – верхняя (вянчаючая) частка калоны ці пілястры. |
| | |

| | |
|---|---|
|  | **Маскарон** (фр. mascaron, італ. mascherone - вялікая маска) – выкананая ў выглядзе галавы ці маскі рэльефная скульптурная дэталь. Маскарон змяшчаецца на замкавых камнях арак, дзвярных і аконных праёмаў, на кансолях, сценах і г.д. |
| | |
|  | **Мятопа** (ад гр. “прастора паміж вачыма”) – прамавугольныя інтэрвалы паміж выходзячымі на фасад будынка тарцамі балак перакрыцця. Мятопы часта ўпрыгожваліся рэльефамі, радзей - жывапісам. |
| | |
|  | **Пандаціў, парус** (ад фр. pendentif) - скульптурнае ляпное упрыгожванне, размешчанае ў вяршыні звода. |
| | |
|  | **Пілястр,** пілястра (ад італ. pilastroад лац. pila - калона, слуп) - вертыкальны выступ сцяны, які звычайна мае базу і капітэль, і тым самым умоўна нагадвае калону, паўкалона. |
| | |

| | |
|---|---|
|  | **Плафон** (фр. plafond - столь) – ляпны арнамент на столі ў выглядзе жывапіснага ці ляпнога арнамента, выявы ці кампазіцыі з архиітэктурна-дэкаратыўных матываў. |
| | |
|  | **Партал** (ад лац. porta - брама) – архітэктурна афармленны ўвход у будынак. |
| | |
|  | **Разетка, разета** - жывапісны ці скульптурны арнаментальны матыў у выглядзе стылізаванай распушчанай кветкі ці аднолькавых па форме лісцеў, сіметрычна размешчаных і радыяльна разыходзячыхся з сэрцавіны. |
| | |
|  | **Фрыз** - дэкаратыўная кампазіцыя ў выглядзе гарызантальнай паласы альбо стужкі, якая аздабляе тую ці іншую частку архітэктурнага збудавання. |
| | |
|  | **Франтон** (ад лац. frons, frontis - лоб, пярэдняя частка сцяны) - завяршэнне (звычайна трохкутнае) фасада будынку, порціка, каланады, абмежаванае дзвюма схіламі па баках і карнізам у аснаванні. |
| | |

| Манументальна-дэкаратыўная скульптура служыць для ўпрыгожвання паркаў і садоў: | |
|---|---|
|  | **Герма** - садова-паркавая скульптурная выява ў выглядзе галавы ці бюста на чатырохграннай апоры. |
| | |
|  | **Паркавая скульптура** ці садова-паркавая скульптура |
| | |
|  | **Фантанная скульптура** |
| | |

Рэльеф (ад італ. rilievo – выступ, выпукласць, пад’ём) – скульптурная выява, размешчаная на плоскасці фона і разлічаная на франтальнае ўспрыняцце. Рэльеф можа мець і самастойнае станкавае значэнне, і з’яўляцца часткай архітэктурнага ці скульптурнага твора.

У рэльефе можна адлюстраваць амаль усё, што дасягальна і ў жывапісу, і ў графіцы: краявід, архітэктурны краявід, складаныя сюжэтныя кампазіцыі і г.д. Таму ў скульптара, які працуе ў рэльефе, больш прасторы для фантазіі, чым у ваяцеля, які стварае круглую скульптуру.

Рэльеф падзяляюць на выпуклы рэльеф: барэльеф, гарэльеф і паглыблены рэльеф: контррэльеф, койланагліф.

| | |
|---|---|
|  | **Барэльеф** (ад фр. bas-relief - нізкі рэльеф) - нізкі рэльеф, разнавіднасць выпуклага рэльефа, у якім выявы выступаюць над плоскасцю фона не больш чым напалову аб’ема.<br>Барэльефам аздабляюць сцены будынкаў, пастаменты помнікаў, стэлы, мемарыяльныя дошкі, манеты, медалі і г.д. |
|  | **Гарэльеф** (ад фр. haut-relief - высокі рэльеф) высокі рэльеф, разнавіднасць выпуклага рэльефа, у якім выява выступае над плоскасцю фона больш чым на палову объема. У гарэльефе фігуры могуць успрымацца круглай скульптурай, якая крыху датыаецца да плоскасці. |
|   | **Контррэльеф** (ад лац. cotra - супраць і рэльеф) - від паглыбленага рэльефа, які ўяўляе сабой свайго роду негатыў барэльефа. У контррэльефе выява не выступае над фонам, а, наадварот, накіравана ўглыб. |

| | |
|---|---|
|  | **Койланагліф** - від паглыбленага рэльефа з паглыбленым контурам і выпуклай мадэліроўкай, сама выява звычайна знаходзіцца на ўзроўні фону. |

Разнавіднасцю барэльефа, распаўсюджанага ў эпоху Адраджэння, з'яўляецца ***жывопісны рэльеф***, у якім фігуры і прадметы моцна сплюснуты, а фон (краявід ці архітэктура) перададзены слабым рэльефам. Жывапісны рэльеф займае месца паміж скульптурай і жывапісам і з'яўляецца падабенствам карціны, г.зн. у ім могуць выкарыстоўвацца перспектыўныя скрачэнні і жывапісныя эфекты (сонечныя промні, аблокі, хвалі). Розніца паміж моцна і слаба выступаючымі над фонам выявамі ў жывапісным рэльефе невялікая, вялікую ролю адыгрывае амаль графічны лінейны малюнак. Жывапісны рэльеф часта выкарыстоўваецца ў рэльефах для перадачы дальняга плану, але часам з дапамогай жывапіснага рэльефа выконвалася выява на першым плане.

Скульптура – адзін з самых старажытных відаў мастацтва. Першыя каменныя і касцяныя статуэткі адносяцца да верхняга палеаліту (каля 33 тыс. да н.э.)

Венера з Холе-Фельс (35 тыс. да н.э.) – старажытнейшая з вядомых палеалетычных скульптур, якая знойдзена ў 2008 годзе ў пячоры Холе-Фельс у Швабскіх Альпах каля нямецкага горада Шэльклінгена, прыкладна ў 20 метрах ад увахода і 3 метрах над сучасным узроўнем мора. Яна выраблена з біўня шарсцістага маманта, была знойдзена пабітай. Выяўлена шэсць фрагментаў (адсутнічае левая рука і плячо). На месцы галавы – адтуліна: магчыма, статуэтка выкарыстоўвалася ў якасці кулона.

| | |
|---|---|
|  |  |
| **Венера з Холе-Фельс,** 35 тыс. да н.э. | |
|  | |
| Венера Вілендорфская, 25-28 тыс. да н. э. | |

## 2.2 Беларуская школа скульптуры

Аддзяленне скульптуры Віленскага ўніверсітэта. Анрэ Ле Брун. К. Ельскі. Б. Балзукевіч. “Новая” школа мастацтва ў Віцебску. План “манументальнай прапаганды”. А. Бразер. Віцебскі мастацка-практычны інстытут. “Проуны” Л. Лісіцкага. Скульптура Н. Суеціна. Кампазіцыі І. Чашніка. Супрэматычныя кампазіцыі Д. Якерсона. Віцебскі мастацкі тэхнікум. Дзейнасць М. Керзіна. Творчасць А. Грубэ. Творчасць А. Бразера. Выпускнікі Віцебскага мастацкага тэхнікума З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў.

Падрыхтоўка скульптараў у Мінскім дзяржаўным вучылішчы. Адкрыццё спецыяльнасці “скульптура” ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Стварэнне аддзялення скульптуры Мінскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчаму мастацтву. Творчасць А. Анікейчыка, Л. Гумілеўскага, Г. Мурамцава, А. Арцімовіча, У. Слабодчыкава, А. Фінскага, С. Логвіна.

Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры.

Скульптура І. Голубева, У. Жбанава, А. Кібальнікава, У. Бабыля, В. Занковіча, Ю. Паўлава, І. Марозава.

*Літараура:*

1. Артимович, И.А. Белорусская школа скульптуры / И.А. Артимович. – Минск : Белорусская государственная академия искусств. – 2011. – 240 с.

## 2.3 Беларуская скульптура XX – пачатку XXI стагоддзя

На развіццё скульптура ў XX – пачатку XXI стагоддзя паўплывалі працэсы грамадска-палітычнага жыцця, гістарычныя падзеі, ідэалогія дзяржавы. У пачатку 1990-ых гг. складваюцца новыя ўмовы развіцця мастацкай практыкі, якую не стрымліваюць афіцыйныя ідэалагічныя нормы. Але разам са становучымі працэсамі назіраюцца і негатыўныя, як, напрыклад, камерцыялізацыя мастацтва, уплыў рынка, малая колькасць дзяржаўных заказаў.

Перыяд станаўлення беларускай савецкай скульптуры прыпадае на 1918 - 1920-ыя гг. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, калі ідзе грамадзянская вайна, беларускія тэрыторыі акупіраваны нямецкімі і польскімі войсамі, у гэтыя часы савецкія ўлады прыступілі да рэалізацыі плана па ўсталяванню ў гарадах помнікаў грамадскім і палітычным дзеячам, рэвалюцыянерам, вучоным, творчым асобам, вобразна-сімвалічных увасабленняў савецкіх ідэй. Яны выконваліся, як правіла, з недаўгавечных матэрыялаў, такіх, як бетон, дрэва, алебастр, гіпс, фанера, і не захаваліся да нашых дзён. Гэтыя работы мелі перш за ўсё агітацыйны характар і ўсталёўваліся ў гарадской забудове. Так, В.Мацвеевым і К.Елісеевым былі створаны помнікі К.Марксу ў Віцебску (1919 г.) і Мінску (1920 г.), Д.Якерсонам – К.Лібкнехту ў Віцебску (1920 г.), А.Бразерам – Г.Лекерту ў Мінску (1927 г.).

1930-ыя гг. у Доме ўрада былі створаны буйнамаштабныя работы, над якімі працавала група аўтараў: Керзін выляпіў бюсты-партрэты К.Маркса і Ф.Энгельса, З.Азгур – Г.Бабёфа, Ф.Дзяржынскага, А.Мяснікова, А.Глебаў – М.Фрунзе.

Над пластычным афармленні галоўнй залы, а таксама памяшканняў перацаваў Андрэй Ануфрыевіч Бембель (1905 – 1986 гг.). Па яго эскізам ім самім, а таксама скульптарамі Г.Ізмайлавым, У.Рытарам, У.Рубанчыкам былі выкананы вялікія фрызападобныя рэльефы, размешчаныя над праходамі ў памяшканні холаў. Іх сюжэты падзяляюцца на дзве часткі.Першую складаюць кампазіцыі, прысвечаныя гісторыі развіцця руху: “Парыжская камуна”, паабапал ад якой знаходзяцца выявы “Змова Бабёфа”, “Барыкады 1848 г. у Парыжы”, “Чытанне камуністычнага маніфеста”, “Паўстанне “Саюза Спартаа” ў Германії”. У друую ўваходзяць сюжэты, аб’яднаныя тэмамі сучаснасці: “Першы пяцігадовы план СССР у дзеянні”, “Сялянскае паўстанне ў акупіраванай Польшчай Заходняй Беларусі”, “Рэвалюцыйная дэманстрацыя ў Германіі на чале з Э.Тэльманам”, “Рэвалюцыйны Кітай”, “Абуджэнне каланіяльных народаў Усходу”. Скульптар выдатна справіўся са

складанай задачай, выяўляючы не толькі ўмоўныя вобразы, але і рэальных гістарычных асоб. Ён па-майстэрску кампануе дзясяткі фігур, паказвае іх у разнастайных рухах, дынамічных ракурсах, звязвае іх з архітэктурнай прасторай. Аўтар выдатна валодае тэхнікай выканання рэльефу. У гады Вялікай Айчыннай вайны манументальная скульптура Дома ўрада была моцна пашкоджана і адноўлена ў аўтарскім выкананні ў 1945 г.

*Літараура:*


1. Войницкий, П.В. Станковая скульптура Беларуси последней четверти XX века / П.В. Войницкий. – Минск : БНТУ, 2015. – 200с.
2. Лазука, Б.А. Гісторыя беларускага мастацтва. У 2 т. Т.II. XVIII – пачатак XXI стагоддзя / Б.А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с. : іл.

2.4 Дэкаратыўная скульптура.

Мастацкі вобраз у скульптуры. Стыль і стылізацыя. Спосабы стылізацыі. Умоўнасць у скульптурным вобразе. Абагульненасць. Лаканізм. Парушэнне прапорцый. Падкрэсленасць сілуэту. Недасказанасць. Акцэнтаванне. Тыпізацыя. Ідэалізацыя.

*Літарараура:*

1. Бралгин, Е.Ю. Декоративная скульптура: учебное пособие / Е.Ю. Бралгин. – Бийск : АГАО им. В.М. Шукшина. – 2014. – 115 с.

# 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Матэрыялы і абсталяванне майстэрні

Абсталяванне майстэрні. Асвятленне. Матэрыялы для лепкі. Інструменты і прылады працы. Спосабы і тэхнікі лепкі: канструктыўны, пластычны, камбінаваны, рэльефная лепка (шляхам нанясення малюнка, шляхам налажэння формы на аснову, шляхам выбірання). Тэхніка адшчыпвання: лепка з шара, шляхам кругавога налепвання. Спіральная тэхніка з жгутоў. Стужкавы спосаб. Лепка з пласцін.

Асаблівасці работы з мяккім матэрыялам. Тэхніка лепкі. Лепка гіпсавых мадэляў. Лепка прадметаў з натуры. Лепка па памяці. Лепка па ўяўленню. Паслядоўнасць у рабоце. Эскіз. Макет. Каркас.

**Майстэрня** для невялікіх работ павінна быць 20-30 м2. Лепш з верхнім асвятленнем. У выпаду штучнага асвятлення лямпа павінна знаходзіцца зверху ці ззаду скульптара. Крыніца асвятлення насупраць скульптара (т.зв. кантравое асвятленне, альбо асвятленне супраць сонца) не дазваляе бачыць форму.

**Станкі** для лепкі выкарыстоўваюць металічныя і драўляныя. Віды станкоў:

- бюставыя, якія выкарыстоўваюць для эскізаў і невялікай скульптуры
- паўфігурныя – для фігур у палову ці ў тры чвэрці натуры,
- фігурныя – для фігур у натуральную велічыню чалавека.

Звычайна выкарыстоўваецца бюставы станок вышынёй прыблізна ад 1,3 да 1,5 м у залежнасці ад роста скульптара.

**Стэкі** для лепкі могуць быць рознай формы. Шмат стэкаў не патрабуецца. Кожны скульптар мае некалькі стэкаў, якімі абыходзіцца пры любой рабоце. Для пачынаючага скульптара дастаткова аднаго стэка, які можна зрабіць самому. Вырабляюцца стэкі з дрэва, косці, металу. Лепш за ўсё вырабляць стэкі з самшытавага дрэва, але можна зрабіць іх з драўніны грушы, яблыні, рабіны, бэзу. Добрыя стэкі з латунных стрыжняў.

Для самастойнага вырабу стэка бярэцца плоскі кавалак дрэва (драўляная лінейка), на якім малююцца контуры будучага стэка, выразаецца патрэбная форма, краі зачышчаюцца наждачнай паперай ці рашпілем. Для трываласці новы стэк неабходна прапітаць якім-небудзь алеем.

Пад час лепкі выарыстоўваюцца таксама скрабкі (кюрэткі) для скаблення і выраўнования планаў шляхам выдалення слаёў гліны. Яны выраблююцца з цвёрдай меднага ці сталёвага дроту, пры гэтым частка кальца зубчатая, якой скрабуць гліну. Велічыня кольцаў розная – ад тонкіх да вялікіх, якімі можна працаваць з вялікімі пласкасцямі.

Для набіўкі плінта (асновы пад разетку) ці фона для будучай кампазіцыі выкарыстоўваюць драўляныя малаткі. Яны могуць быць прызматычнай ці цыліндрычнай формы, а таксама розныя па памеру. Вырабляюць іх з сасны ці бярозы, прапітваюць алеем.

Для вымярэння і пераносу памераў выкарыстоўваюць крон-цыркулі.

**Матэрыялы** для вырабу скульптуры выкарыстоўваюцца разнастайныя: метал, камень, гліна і абпаленая гліна (фаянс, фарфор, тэракота, маёліка), гіпс, дрэва, косць.

Пад час **лепкі** скульптары звычайна выарыстоўваюць гліну, пластылін, воск, эглін. Кожнаму з гэтых матэрыялаў уласцівы пэўныя якасці, якія дазваляюць карыстацца імі ў залежнасці ад умоў і прызначэння работы.

Практыка паказала, што найбольш зручным матэрыялам для лепкі з’яўляецца **гліна**. яна вельмі эластычная і падатлівая ў працы.

Гліна бывае тлустая, вязкая, з вялікай колькасцю пяска і наадварот. Адрозніваюць гліну і па яе адценням: яна сустракаецца чырвоная, шэрая, шэравата-зялёная, карычневая. Ляпіць можна з гліны любога колеру, але скульптары аддяюць перавагу шэравата-зялёным гатункам, таму што нейтральны тон дазваляе добра ўспрымаць вылепленую форму і не стамляе вока.

Колер гліны – гэта колер пасля абпалу. Калі чорная гліна пасля абпалу становіцца белай, яе называюць белай. Гліна бывае шэрая, вохрыстая, сіневатая, чырвоная, чорная, вохрыста-зялёная, цёмна-зялёная.

Перад работай гліна замочваецца ў вадзе: раздробленая гліна слаямі засыпаецца ў кадушку ці спецыяльна збітую з тоўстых дошак скрыню. Кожны слой замочваецца вадой і спецыяльна змешваецца лапатай. Затым засыпаецца новы слой, які таксама змочваецца вадой і разрыхляецца. Пасля гэтага гліна прабіваецца да дна ў некалькіх месцах, утвораныя адтуліны запаўняюцца вадой. У такім выглядзе гліна застаецца на два-тры дні. Затым гліну перамешваюць рукамі, вымаюць каменчыкі. Калі гліна атрымалася занадта вадкай, яе раскладаюць на дошку ці гіпсавай пліце, каб выдаліць залішнюю вільгаць. Калі гліна перастае ліпнуць да рук, яна гатова для лепкі.

Гліну, прызначаную для лепкі, можна ўтрымліваць у той жа кадушцы ці скрыні, толькі зверху накрываць анучай ці цыратай. Гэта дае магчымасць захоўваць яе вільготнай і прыдатнай для працы. Незавершаную працу да

наступнага сеансу работы таксама накрываюць вільготнай анучай і поліэтыленам.

Засохлую гліну можна зноў выкарыстацьдля работы: разбіць на кавалкі і заліць вадой. Перад работай ў падсохлую гліну дадаюць вады.

**Пластылін**. Другім матэрыялам для лепкі з’яўляецца пластылін. Ён вельмі неабходны для эскізных і мадэльных работ. Складаецца пластылін з воску (пчалінага ці мінеральнага) і напаўняльнікаў. Пластыліны бываюць розных колераў і рознай шчыльнасці. Часцей выкарыстоўваюць васкова-гліняныя, васкова-серна-смаловыя, васкова-жыравыя.

Васкова-гліняны пластылін утвараецца наступным чынам. Добра ачышчаная і вымешаная з вадой скульптурная гліна правяліваецца на паветры, а затым размінаецца. Пасля другаснага правяльвання яе змешваюць з мінеральным воскам, загадзе расплаўленым на “вадзяной бані”. Атрыманая маса зноў размінаецца два ці тры разы. Калі маса цвёрдая, цяжкаразмінаемая, неябходна дадаць у яе воск, зноў размяць і паўтарыць гэта да таго часу, пакуль яна не стане прыдатнай для лепкі.

Можна прыгатаваць пластылін і з сухой гліны, але для гэтага яе трэба вельмі дробна расцерці і прасеяць. Спосаб прыгатавання той жа. Але буйныя часціцы могуць заставацца.

**Воск** для лепкі звычайна вырабляецца з чыстага пчалінага воску з дабаўленнем алейнай фарбы і невялікай колькасці церпенціну ці ачышчанага вазеліну. Калі патрабуецца воск больш цвёрды, да яго дадаюць каніфоль, добра прасушаны крухмал і тонкацёртыя алейныя бяліла. Па жаданню скульптара ў гэтую сумесь можна дадаць і іншыя колеры алейных фарбаў.

Не так даўно вынайдзены спосаб новага пластыліну, так званага **эгліну**, пры якім да звычайнай гліны дадаюцца прадукты перапрацоўкі нафты.

Перавага пластыліну перад глінай у тым, што першы не высыхае, захоўвае пластычнасць пры любых умовах і выкарыстоўваць можна шматразова.

**Працэс лепкі.** Лепкай называюць тэхніку выканання скульптуры з мяккіх матэрыялаў, якімі могуць быць гліна, пластылін, воск і інш. У адрозненне ад ваяння, калі лішкі здымаюцца з паверхні апрацоўваемага матэрыяла (камню, дрэва), пры лепцы матэрыял набіраецца да неабходнай массы, а лішкі заўсёды можна зняць пад час работы.

Кожная скульптура павінна мець **плінт** той ці іншай формы, прапарцыянальна адпаведны скульптуры. Плінт неабходны як для апоры асобных частак скульптуры, так і для агульнай кампазіцыі, для ўспрыняцця завершанай.

Работа пачынаецца з нізу, з фундамента. Размеркаваўшы массы ў адпаведнасці з натурай і надаўшы ім адпаведны рух, пачынаюць дэталёвую прапрацоўку.

Маленькія фігуры (да 10 см) лепяцца без **каркаса**. Для фігуры ці галавы чалавека ствараюць каркасы, якія іх падтрымліваюць. Лепка галавы адбываецца на драўляным каркасе: дзеля гэтага некалькі дошак злучаюць разам у лёгкі шчыток, да якога вертыкальна прымацоўваюць брусок, вышыня якога павінна быць на 1 см ніжэй вышыні будучай галавы. Для лепкі глінай да бруска прымацоўваюць некалькі адрэзкаў дроту з замацаванымі на канцы невялікімі крыжавінамі.

Каркас для бюста адрозніваецца ад папярэдняга толькі тым, што да вертыкальнага стрыжню прымацоўваецца гарызантальны – для падтрымання плячэй.

Калі фігура больш за 20 см, робіцца каркас з улікам размяшчэння фігуры ў прасторы. Дрот для каркаса павінен быць трывалы, але мяккі.

Пачынаюць лепку фігуры з пракладкі глінянага плінта, затым выконваюць агульную пракладку ўсёй фігуры з удакладненнем прапорцый і суадносін мас.

У працэсе лепкі важна прызвычаіцца працаваць пальцамі. Неабходна развіць да высокай ступені пачуццё асязання матэрыялу, каб пальцы так адчувалі форму, як вока яе бачыць. Ляпіць трэба двума рукамі, што дазволіць адначасова весці работу з правага і лева боку аб’ета і дапаможа ўтрымліваць у полі зроку ўвесь аб’ект цалкам.

**Фактура** лепкі можа быць гладкай ці шурпатай у залежнасці ад вобразнай ці кампазіцыйнай пабудовы работы. Разнастайная фактура ўзбагачае работу. Гульня фактур робіць работу разнастайнай. Напрыклад, твар і рукі могуць быць гладкімі, а адзенне шурпатым.

**Тэхнікі вырабу** скульптуры разнастайныя:

- ліццё,
- коўка,
- чаканка,
- высяканне,
- лепка,
- разьба.

**Спосабы лепкі Канструктыўны**. Прадмет ствараецца з асобных частак. Пачынаецца работа з асноўнай, найбольш буйной часткі. Напрыклад, спачатку тулава. Потым, адносна тулава, ствараюцца прапарцыянальныя ногі, рукі, галава. Для лепкі парных частак трэба падрыхтаваць аднолькавыя

кавалкі матэрыялу. На апошняй стадыі ўсе дэталі паслядоўна злучаюцца з асноўнай, потым прапрацоўваюцца дэталі.

**Пластычны**. Лепка з цэлага кавалка, калі ўсе часткі выцягваюцца з аднаго кавалка матэрыялу, папярэдне скатанага ў шарык. Такім чынам лепяцца найбольш простыя па сілуэту фігуркі.

**Камбінаваны**. Гэты спосаб лепкі аб’ядноўвае лепку з цэлага кавалку і асобных частак.Напрыклад, фігурка лепіцца з цэлага кавалка, а галава асобна.

**Рэльефная лепка**. Шляхам нанясення малюнка. праз плёнку. Паверхня павінна быць гладкай і роўнай. Плінт засцілаецца цэлафанам і малюнак наносіцца стэкай альбо зубачысткай.

Шляхам налажэння асобных элементаў на аснову. Шарыкі, жгуты, палоскі накладаюцца і могуць прадаўліваццa наскрозь стэкай.

Шляхам налажэння і адбівання фактурнай тканіны альбо адціскання іншых прадметаў.

Шляхам выбірання матэрыялу. Таўшчыня пласта пад аснову не павінна быць менш за 2-3 см. Спачатку стэкай на паверхні праз плёнку ці без яе наносіцца малюнак, затым здымаецца аднольавы слой з паверхні асновы там, дзе няма малюнку. Такім чынам, малюнак будзе рэльефным, выступаючым.

**Тэхніка адшчыпвання.**

**Спіральная тэхніка са жгутоў**

**Стужкавы спосаб**

**Лепка з пласцін**

## 3.2 Лепка геаметрычных цел

*Нацюрморт з простых геаметрычных прадметаў(круглая скульптура)*

Пастаноўка з трох геаметрычных прадметаў (куб, конус, піраміда, цыліндр, прызма, шар). Работа выконваецца ў маштабе 1:2.

Задача: пабудаваць простыя геаметрычныя прадметы ў прасторы, дакладна перадаць іх кампазіцыю, памер, прапорцыі, маштаб.

*Литаратура:*

1. Лантери, Э. Лепка / Э. Лантери. – М. : Изд-во Академии Художеств СССР, 1963. – 335 с.
2. Школа изобразительного искусства : Вып. 3-е изд., испр. и доп. / А.Н. Буйнов [и др.]. – М. : Изобраз. Искусство, 1988. – 160 с.

3.3 Рэльеф. Разетка. Нацюрморт з прадметаў побыту.

Умоўнасць перадачы аб'ёма ў рэльефе. Прынцыпы перспектыўнага скарачэння і суадносіны планаў у рэльефе. Паслядоўнасць работы над рэльефам.

Копія разеткі (матэрыял: пластылін, гліна). Работа выконваецца ў натуральную велічыню. Пабудава складанай формы ў рэльефе, перадача прапорцый, памеру, маштабу, пластыкі.

Аўтарская разетка: лепка разеткі па ўяўленню (матэрыял: пластылін, гліна). Стылізаваны раслінкавы элемент з арыгінальным пластычным характарам. Замалёўкі раслінкавых аб'ектаў. Этапы стылізацыі.

Творчая работа. Раслінкавы ці геаметрычны элемент нескладанай формы, які ўяўляе пластычную цікавасць.. Памер работы: да 20-23 см.

Задача: на аснове замалёвак раслінкавай формы зрабіць паэтапную стылізацыю ў мяккім матэрыяле; на апошнім этапе выканаць абраны раслінкавы элемент у выглядзе разеткі.

Нацюрморт. Лепка трох прадметаў побыту на драпіроўцы з натуры. Работа ў маштабе 1:2. Кампазіцыя. Пабудава прадметаў. Перадача прапорцый, маштабу, памеру, пластыкі, характара матэрыялу.Перадача глбіні прасторы.

*Літаратура:*

1. Вельянинова, Л.А. Скульптура. Лепка розетки: учеб.-метод. пособие для студентов специальности “Архитектура” / Л.А. Вельянинова, С.И. Вельянинов. – Гомель : БелГУТ, 2012. – 48 с.

# 4. РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў

Тэматыка рэфератаў і прэзентацыйі:

1. Манументальныя помнікі Беларусі
2. Манументальна-дэкаратыўныя помнікі Беларусі
3. Манумент Перамогі (Мінск, 1954): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння.
4. Мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой” (Брэст, 1971) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння.
5. Архітэктурна-скульптурны комплекс “Мінск – горад-герой” (Мінск, 1985) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння.
6. Мемарыяльны комплекс “Курган Славы Савецкая Арміі – вызваліцельніцы Беларусі” (Мінская вобл., Смалявіцкі р-н, 1969) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння
7. Мемарыяльны комплекс “Хатынь” (Мінская вобл., Лагойскі р-н, 1969).
8. Мемарыяльны комплекс “Чырвоны Бераг” (Гомельская вобл., Жлобінскі р-н, 2008) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння.
9. Помнік “Сынам Айчыны, якія загінулі за яе межамі” (Мінск, 1996) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння.
10. Мемарыял “Дзецям вайны” (Магілёў, 2009) ): гісторыя стварэння і асаблівасці кампазіцыйна-пластычнага рашэння
11. Творчасць Міхаіла Керзіна
12. Творчасць Андрэя Бембеля
13. Творчасць Аляксея Глебава
14. Творчасць Заіра Азгура. Мемарыяльны музей-майстэрня З.І.Азгура
15. Творчасць Анатоля Анікейчыка
16. Творчасць Генадзя Мурамцава
17. Творчасць Уладзіміра Слабодчыкава
18. Творчасць Аляксандра Фінскага
19. Творчасць Сяргея Логвіна
20. Творчасць Барыса Лазарэвіча
21. Творчасць Леаніда Давідзенкі
22. Творчасць Святланы Гарбуновай
23. Творчасць Андрэя Засціцкага
24. Творчасць Івана Міско
25. Творчасць Андрэя Асташова

26. Творчасць Максіма Петруля
27. Творчасць Уладзіміра Жбанава
28. Творчасць Ігара Голубева
29. Творчасць Мікалая Байрачнага
30. Творчасць Сяргея Бандарэнка
31. Творчасць Паўла Вайніцкага
32. Творчасць Алега Варвашэні
33. Творчасць магілёўскіх сульптараў. Алег Вераб’ёў
34. Творчасць Яўгена Колчава
35. Творчасць Алега Купрыянава
36. Творчасць гродзенскіх скульптараў. Уладзімір Панцялееў
37. Дынастыя скульптараў: Аганавы
38. Дынастыя скульптараў: Гумілеўскія
39. Дынастыя мастакоў Шапо.
